

*Віктар Малых і аркестр рускіх народных інструментаў*

Нэлі РАДЗЬКО

**#ЮБІЛЕІ**

**Выбітны наваполацкі музыкант, педагог і дырыжор, ганаровы грамадзянін горада, член Беларускага саюза кампазітараў Віктар Малых даў вялікі гала-канцэрт да свайго 70-годдзя.**

Віктар Леанідавіч – аўтар больш за 50 музычных палотнаў, сярод якіх «Еўфрасіння», «Элегія», гімн Полацкага дзяржуніверсітэта і многія іншыя. Яго мелодыі раскрываюць душу народа, ствараюць імідж Нафтаграда, уваходзяць у залаты фонд нацыянальнага мастацтва. Атрымаць асалоду ад багацця і разнастайнасці творчасці юбіляра гледачы маглі ў актавай зале Наваполацкага музкаледжа – установе, якой педагог прысвяціў сваю прафесійную біяграфію.

Яркія, кантрастныя, па-майстэрску напісаныя кампазіцыі ў выкананні аркестра рускіх народных інструментаў выклікалі гарачы эмацыянальны водгук у слухачоў. Віртуозна прадэманстравалі жанравую палітру мастацкага генія Віктара Малых хор народнай песні «Рэчанька», вакалісты Кіра Рэйх, Юлія Малых, Яўген Ткачонак, акардэаніст Аляксандр Шабуцкі, дуэт цымбалістаў у складзе Марыі Яркавец і Вікторыі Баранавай.

Маэстра дырыжыраваў на працягу ўсёй праграмы і прымаў шматлікія віншаванні, у тым ліку відэапаштоўкі ад калег з Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускага саюза кампазітараў.

Юбілейны канцэрт прайшоў пры поўным аншлагу і стаў яркай культурнай падзеяй горада.



*Хор «Рэчанька»*



*Канцэрт сабраў поўную залу гасцей*